Падтрымай "Вясну" на PATREON

Таццяну Севярынец аштрафавалі на 810 рублёў: скандавала «Жыве Беларусь!» і «Стоп таракан!»

23.07.2020 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Таццяна Севярынец (справа) падчас суду. Фота з сайта "Віцебскай Вясны"

Чарговы судовы працэс над актывісткай БХД **Таццянай Севярынец** прайшоў 22 ліпеня ў судзе Чыгуначнага раёну Віцебску. Суддзя **Дзяніс Аляксеенка** прызнаў Севярынец вінаватай у парушэнні заканадаўства аб масавых мерапрыемствах (ч. 3 арт. 23.34 КаАП) і аштрафаваў на 30 базавых велічыняў. Пра гэта паведамляецца на сайце "Віцебскай Вясны".

Як зафіксавана ў двух адміністрацыйных пратаколах, складзеных на **Таццяну Севярынец** маёрам міліцыі **Склімянком**, жанчына ўзяла актыўны ўдзел у не дазволеных уладамі масавых мерапрыемствах каля ГЦ «Марка-Сіці» 31 траўня і 7 чэрвеня. На пікетах *«публічна выказвала свае*

асабістыя і грамадзка-палітычныя інтарэсы, скандавала лозунгі «Жыве Беларусь!» і «Стоп таракан!»

На судзе Таццяна Севярынец спаслалася на арт. 61 Выбарчага кодэксу, згодна з якім падчас выбарчай кампаніі збор подпісаў можа ажыццяўляцца ў форме пікетавання, дазвол на які браць не трэба. 31 траўня яна прыйшла паставіць свой подпіс за **Святлану Ціханоўскую** і не адмаўлялася ад таго, што выступіла на пікеце, тым больш што ў ім браў удзел ейны сын – цяпер палітвязень **Павел Севярынец**. Імпрэза было абсалютна законнай, сцвердзіла Таццяна Севярынец.

Актывістка не пагадзілася з тым, што нібыта заклікала на пікеце да байкоту выбараў. Заклікала толькі *«не баяцца выказваць сваё меркаванне, бо гэтае права гарантуецца і заканадаўствам, і Канстытуцыяй»*.

Што да пікетавання 7 чэрвеня, то спадарыня Таццяна не адмовілася ад сваёй прысутнасці на ім, але запэўніла, што ніякіх плакатаў, як гэта сцвярджалася ў пратаколе, не выкарыстоўвала і да байкоту не заклікала.

> *«Шкада, што нашая міліцыя столькі часу губляе на збор усёй гэтай інфармацыі, падсоўвае яе ў суды – у той час як у краіне столькі праблемаў! Маючы вялікі жыццёвы досвед, скажу: гэта настолькі непрыгожа, настолькі не адпавядае жыццю і ідэям свабоднай дэмакратычнай краіны, што проста горка!»* – абурылася Таццяна Севярынец, выслухаўшы доўгі пералік прыкладзеных да справы дакументаў.



Суддзя Дзяніс Аляксеенка. Фота з сайта "Віцебскай Вясны"

Адзначым, што суддзя Дзяніс Аляксеенка на самым пачатку працэсу задаволіў хадайніцтва Севярынец аб магчымасці весці відэаздымкі. Але на гэтым праявы дэмакратычнага суду і скончыліся. Шчырая прамова Таццяны Севярынец ніяк не паўплывала на канчатковае рашэнне суду: штраф – 30 базавых велічынь (810 рублёў).

Твитнуть







Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне

ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў





АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць залежнікамі" – вясноўцы на акцыі ў Вільні

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh













E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY